Падтрымай "Вясну" на PATREON

Суды за акцыю салідарнасці з Эдуардам Пальчысам

30.06.2016 **Тэгі**: суды, адміністратыўны пераслед



Акцыя салідарнасці з Эдуардам Пальчысам. 9 чэрвеня ў Мінску.

Суд Маскоўскага раёна Менска разглядае адміністрацыйныя справы ўдзельнікаў акцыі салідарнасці з Эдуардам Пальчысам. 9 чэрвеня на заклік Паўла Севярынца сямёра актывістаў правялі ў Мінску акцыю салідарнасці з заснавальнікам сайту 1863х Эдуардам Пальчысам ("Джонам Сільверам"), які зараз утрымліваецца ў следчым ізалятары ў СІЗА-1.

Судзяць актывіста АГП **Дзяніса Краўчука** (9-30), сустаршыню БХД **Паўла Севярынца** (9-30), рэжысёра **Вольгу Нікалайчык**, актывіста «Еўрапейскай Беларусі» **Максіма Вінярскага** (15-30), актывістку **Наталлю Гарачку-Басалыгу** і актывіста БХД **Паўла Пракаповіча**.

Актывіста АГП **Антося Жылко** паспелі асудзіць у панядзелак, 27 чэрвеня, і пакараць штрафам у памеры 50 базавых велічынь.

Сустаршыню БХД **Паўла Севярынца** вінавацяць у арганізацыі несанкцыянаванай акцыі. Адміністрацыйная справа заведзеная паводле часткі 3 арт.23.34 КаАП. Севярынца судзіла Тацяна Матыль. Ён на суд не з'явіўся. Пастанова суддзі - 50 базавых велічынь.

Актывіст АГП **Дзяніс Краўчук** аштрафаваны на 25 базавых велічынь (5 250 000 рублёў).


Натальлю Гарачку-Басалыгу судзіла суддзя Тацяна Пірожнікава. Пастанова — штраф 50 базавых велічынь (10 500 000 рублёў).

Вольга Нікалайчык на суд не з'явілася і вынік разгляду справы пакуль невядомы.


Рэдактар сайта www.1863x.com Эдуард Пальчыс быў затрыманы на тэрыторыі Расійскай Федэрацыі і 26 траўня экстрадзіраваны ў Беларусь. Ён абвінавачваецца паводле ч. 1 арт. 130 (“Распальванне расавай, нацыянальнай ці рэлігійнай варожасці або розні”) і ч. 2 арт. 343 (“Распаўсюджванне парнаграфічных матэрыялаў”) Крымінальнага кодэксу Рэспублікі Беларусь.

Твитнуть









Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску


"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур’ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"



ГАЛОЎНАЕ

Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася

чарговай нагодай для ціску





АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

Затрыманні і арышты: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

Мужчыну асудзілі за ўдзел у Маршы і бойку з прычыны "палітычнай абстаноўкі" у 2020 годзе

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

"У думках з тымі, хто сустракае гэты дзень за кратамі". Міжнародная супольнасць віншуе “Вясну” з днём народзінаў

Мужчыну асудзілі на год "хіміі" за сарваны сцяг


"Мы не хочам быць заложнікамі", – вясноўцы на акцыі ў Вільні

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць







ПАРТНЁРСТВА

СЯБРОЎСТВА

























E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY